**Пашковіч, А.** Пашчасціла выжыць / А. Пашковіч // Патрыёт (Ушачы). — 2007. — 14 лют. — С. 1.

# ПАШЧАСЦІЛА ВЫЖЫЦЬ



***Афганістан... Горкая праўда падзей 10-гадовай вайны яшчэ не адно дзесяцігоддзе будзе выплываць на паверхню праз успаміны яе непасрэдных удзельнікаў. Толькі нікога яна ўжо не грэе, і нават не вылечвае параненыя душы тых, хто страціў на полі бою сваіх сыноў, каханых, братоў, сяброў... А ўспаміны пра падзеі афганскай вайны заўсёды балючыя.***

Васіль Віктаравіч Полазаў быў прызваны на тэрміновую службу 14 лістапада 1984 года, а 17 студзеня 1985-га – хлопец быў ужо ў афганскім горадзе Найбабад. Яшчэ ў вучэбцы зразумелі юнакі, што рыхтуюць іх на вайну, бо давалі навыкі ваенных дзеянняў з улікам горнай мясцовасці. Калі за маладым папаўненнем прыехалі «купцы», як іх называлі, з Туркестанскай ваеннай акругі, то адбіралі самых фізічна моцных байцоў. У іх лік адразу трапіў стралок Васіль Полазаў з Ушач і яго сябра-зямляк Анатоль Анікейчык (родам з Дзедунова Дубраўскага сельсавета). Так і прайшлі з ім поплеч праз вайну. Служылі ў дарожна-камендацкай брыгадзе – адзінай на ўвесь Афганістан, суправаджалі калоны.

– Многа разоў былі пад абстрэлам душманаў, – успамінае Васіль Віктаравіч, – аднак ніколі не траплялі ні ў палон, ні ў сітуацыю поўнага разгрому. На маіх вачах былі застрэлены баявыя сябры... У 20 гадоў гэта было самым жудасным відовішчам, ад якога раны на сэрцы будуць краваточыць усё жыццё.

Дома ад Васіля бацькі і дзве сястры з нецярпеннем чакалі кожнай вестачкі. А праз два гады са слязамі радасці моцна абдымалі свайго салдата на роднай зямлі.

Маці Васіля ўжо адышла ў іншы свет, а бацька да сённяшняга захоўвае салдацкія пісьмы сына з Афганістана, якія нават пранумараваны, як каштоўныя дакументы.

– Я кожны год сустракаюся са сваім баявым сябрам Анатолем Анікейчыкам, які зараз жыве ў Санкт-Пецярбургу, – расказвае В. Полазаў. – Час ад часу наладжваем сустрэчы з воінамі-інтэрнацыяналістамі, хто пражывае ў раёне, абменьваемся ўспамінамі.

Заўсёды прыгадваем імёны тых, хто загінуў на гэтай жудаснай вайне. Нам засталося толькі з гордасцю захоўваць памяць аб іх.

**А. Пашковіч**

На здымку: воін-інтэрнацыяналіст Васіль Віктаравіч Полазаў